ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 287 (1254) ‖ СУБОТА, 13-га сьнежня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 "
6 месяцаў	1 р. 80 "
1 год	3 р. 30 "

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

АБ РОСЬЦЕ КОМСАМОЛУ

Рост комсамольскай організацыі зьяўляецца асноўным барометрам дзейнасьці організацыі. Ад таго, каго мы ўцягваем у комсамол, за кошт якіх соцыяльных пластоў мы расьцём, залежыць зьмест работы організацыі, якасьці дзейнасьці саюзу.

За час з IX зьезду ЛКСМБ саюз шмат чаго перажыў. За гэты час у вытворчасьці ня толькі зарадзіўся энтузіязм соцыялістычнай працы—соцспаборніцтва і ўдарніцтва, але і ператварыўся ў магутны рух мас, перарос у вышэйшую ступень—барацьбу за плян, рацыяналізатарскі рух і інш. У вёсцы мы маем—масавы рух — колектывізацыю, барацьбу за соцыялістычную організацыю працы. Усё гэта дасягалася ў жорсткай барацьбе з клясавым ворагам.

Непазбежна на гэтай аснове адбываўся і адбываецца нябывалы рост палітычнай актыўнасьці працоўнай моладзі.

Гэта, бязумоўна, мае непасрэдную сувязь з становішчам росту комсамольскай організацыі. Зараз патрэбна прыглядзецца да таго, як мы організацыйна афармляем узрастаючую палітычную актыўнасьць рабочай моладзі — за лік каго растучы растучы.

Калі прагледзець рост організацыі, пачынаючы з 1928 г., дык перад намі паўстане наступны малюнак. Калі ў 1928 г., за пэрыод красавік-чэрвень, прынята 3313 чал., дык за гэты-ж квартал у 1929 г. было прынята 4337 чал., у 1930 г.—6611 чал., калі за ліпень-верасень 1928 г. было прынята 2808 чал., дык за той-жа пэрыод у 1929 г. было прынята 5327 чал., а ў 1930 г.—7083 чал.

Тут можа ўстаць законнае пытаньне: а як-жа з якасьцю росту? Першым паказчыкам якасьці росту зьяўляецца склад організацыі. Калі мы да першага студзеня 1930 г. мелі сыстэматычнае зьніжэньне рабочага ядра ў КСМ і на першае студзеня 1930 г. рабочыя ў організацыі складалі 31,9 проц., то на 1-IV 1930 г. было ўжо 32,2 проц., на 1-VII 1930 г. — 32,3 проц. і на 1-X 1930 г. рабочыя ўжо складалі 35,5 проц., тады як на 1-X 1929 г. яны складалі 32 проц. і на 1-X 1928 г.—32,9 проц.

Разам з гэтым сыстэматычна падымаецца ўдзельная вага батрацтва ў організацыі, на 1-X 1928 г. батракі складалі 7,5 проц. да агульнага складу організацыі, на 1-X 1929 г.—9,8 проц. і на 1-X 1930 году—11,9 проц.

Гэтыя лічбы, як абсалютнага росту організацыі, так і якаснага складу яе, даюць права сказаць, што мы маем значнае ўзрастаньне тэмпаў росту комсамолу, прычым яны спрыяюць хуткаму палепшаньню якаснага складу організацыі. Але, калі параўнаць тэмп росту КСМ організацыі з ростам партыі, мы атрымаем наступны малюнак. У партыю за 1 паўгодзьдзе 1929 г. прынята 3194 чалавекі, а за 1-е паўгодзьдзе 1930 г. прынята ўжо 7008 чал. Гэта значыць тэмп росту павялічыўся больш чым у 2 разы. У комсамоле-ж прынята за 1 паўгодзьдзе 1929 г. 8667 чал., а за 1 паўгодзьдзе 1930 г.—12967 чал., што дае павялічэньне тэмпу росту толькі ў паўтара разы. А трэба сказаць, што комсамол можа расьці больш сьмела, ахопліваць больш шырокія колы, чым партыя. Да гэтага трэба яшчэ дадаць, што мы маем ня мала выпадкаў, калі лепшыя ўдарнікі на вытворчасьці не ахоплены комсамолам, што наогул вялікі процант ударнікаў—некомсамольцы і што рабочая моладзь у нас на Беларусі ахоплена комсамолам толькі на 38,5 проц.

Прычына такога становішча ў тым, што калі партыя можа організацыйна замацаваць палітычную актыўнасьць рабочае клясы, можа хутка, на аснове ўзрослай актыўнасьці рабочае клясы, уцягнуць у сябе лепшыя яе элемэнты, дык мы, комсамол, слаба організацыйна замацоўваем узрослую актыўнасьць рабочае моладзі, наша організацыйная работа не заўсёды адпавядае росту палітычнай актыўнасьці рабочай моладзі. Адсюль і тэмп нашага росту за лік рабочай моладзі, ня гледзячы на яго павышэньне, усё-ж адстае ад росту палітычнай актыўнасьці рабочай моладзі.

Такое палажэньне лішні раз падкрэсьлівае, што неабходна ўзмацніць работу па выкананьню лёзунгу аб 100 проц. ўцягненьні рабочай моладзі ў комсамол, павесьці рашучую барацьбу з усякімі спробамі зьняць гэты лёзунг. А такія спробы ёсьць. Адна з гэтых спроб матывуецца тым, што мы вычарпалі асноўны касьцяк рабочае моладзі, што ўся карэнная моладзь—у комсамоле, і другая, зразумела, больш замаскаваная высоўваецца т. Віткоўскім.

Ці вычарпалі мы асноўны касьцяк рабочай моладзі? Адказ на гэта можна вывесьці з наступнага:

Калі на прадпрыемствах занята карэннай рабочай моладзі г. зн.—выхадцаў з рабочага асяродку 8220 чал., то ў комсамоле з гэтай моладзі—толькі 3218 чал., альбо 39,1 проц. Адсюль ясны вывад, што мы маем яшчэ агромністую базу для росту комсамолу за лік карэннай рабочай моладзі, ня кажучы ўжо аб выпадках з саматужнікаў, сялян, служачых.

Значны час працавалі на прадпрыемствах, пераварыліся ў пролетарскім катле і дастойны быць у шэрагах комсамолу.

Цяпер аб прапанове тав. Віткоўскага. Ён прапануе прымаць у саюз толькі ўдарнікаў. Што значыць так ставіць пытаньне? Гэта значыць, што мы ставім пэўныя рамкі для прыёму ў комсамол рабочай моладзі, адмаўляемся ад лёзунгу 100 проц. уцягненьня рабочай моладзі ў комсамол. Праўда, апошнія рашэньні гавораць аб тым, што лёзунг 100 проц. уцягненьня ў комсамол распаўсюджваецца толькі на карэнную рабочую моладзь, а на іншыя соцыяльныя праслойкі гэты лёзунг распаўсюджваецца пры ўмове ня менш 3-х гадовага стажу на вытворчасьці. Але гэта абмежаваньне соцыяльнага парадку. Тав. Віткоўскі сваім лёзунгам здымае гэтае разьмежаваньне, стрыжэ ўсіх пад адзін грэбень.

А чаму здымаць гэтую ўстаноўку нельга, яскрава гаворыць тое, што па свойму соцыяльнаму паходжаньню рабочая моладзь Беларусі складаецца з наступных соцыяльных катэгорый: выхадцы з рабочых складаюць толькі 57,6 проц. агульнай колькасьці рабочай моладзі, 8,2 проц. складаюць выхадцы з служачых, 15,9 проц.—сяляне, 11,8 проц. саматужнікі, 1 проц.—гандляры, паўтара процанты—іншыя, і 4 проц.—соцыяльнае паходжаньне невядома.

Ці можна да ўсіх гэтых праслоек падыходзіць з аднэй меркай? Бязумоўна нельга.

У Віткоўскага-ж выходзіць якраз так, што—„левай“ фразай—„у комсамол прымаць толькі ўдарнікаў“—прыкрываюцца правыя справы: здымаецца лёзунг 100 проц. рабочай моладзі ў комсамол, рэкомэндуецца аднолькавы падыход да прыёму ў КСМ і карэннага рабочага і выхадца з гандляроў. А зараз, больш чым калі-б тое ні было, патрабуецца чоткасьць і ўвага да рэгуляваньня соцыяльнага складу комсамолу.

Характэрны момант мінулага пэрыоду таксама і ў тым, што нам ўдалося дасягнуць пералому ў галіне ўцягненьня кваліфікаванай моладзі ў комсамол. Так, калі высока-кваліфікаванае юнацтва ахоплена комсамолам на 59,8 проц., і кваліфікаванае—на 48,8 проц., дык юнацтва ніскай кваліфікацыі ахоплена толькі на 45.7 проц., і некваліфікаванае—на 31 проц. Бязумоўна, гэта—станоўчы момант, які гаворыць аб тым, што комсамол шчыльна падышоў да вытворчасьці. Але ў той-жа самы час ён высоўвае перад намі задачу прыстасаваць нашу работу да пэасобных груп рабочай моладзі і, асабліва, узмацніць работу сярод мала кваліфікаванай і некваліфікаванай яе часткі, якая складае на сёньня галоўную масу рабочай моладзі (88 проц.).

Асабліва востра стаіць пытаньне аб уцягненьні ў комсамол дзяўчат-работніц. Вось характэрныя лічбы становішча дзяўчат у прамысловасьці. У параўнаньні з хлопцамі дзяўчат у прамысловасьці занята амаль што аднолькавая колькасьць. Але ў кваліфікацыі іх рэзкая розьніца. Калі ў прамысловасьці з агульнай колькасьці 7226 чалавек хлапцоў занята высока-кваліфікаваных 116, кваліфікаваных 881, малакваліфікаваных—2391, некваліфікаваных--2570, вучняў--881, дык з 7049 дзяўчат, высокакваліфікаваных толькі—6, кваліфікаваных—423, малакваліфікаваных—1854, некваліфікаваных—3764, вучняў—583. Гэтыя лічбы гавораць за тое, што адным з важнейшых сродкаў ахопу дзяўчат комсамолам павінна быць работа па павышэньню кваліфікацыю дзяўчат

Соцыяльна эканомічныя зрухі, якія адбыліся на вёсцы некалькі інакш зараз ставяць пытаньне аб росьце вясковага комсамолу. Наяўнасьць велізарнай колькасьці моладзі ў колгасе, рост колгаснага руху з усёй сілай ставяць пытаньне—каго прымаць у комсамол на вёсцы? Канчаткова вырашыць гэта пытаньне зьезд комсамолу. Аднак ужо зараз патрэбна, каб уся організацыя над ім падумала. Ужо зараз магчыма наметціць некаторыя шляхі да вырашэньня гэтага пытаньня. Калі прагледзець рост вясковага комсамолу то можна сустрэцца з наступнымі сыгналамі.

Побач з павялічэньнем росту за лік батракоў у некаторых організацыях выглядаецца асераднячваньне росту. Ёсьць тэндэнцыя да павялічэньня удзельнае вагі ў серадняков у агульным росьце, а побач ёсьць і такія думкі, каб зусім спыніць прыём серадняцкай моладзі—неколгасьнікаў.

Гэтыя тэндэнцыі гавораць за тое, што асноўнае—гэта вызначэньне адносін да серадняка. Мне здаецца, што вырашэньне гэтага пытаньня павінна пайсьці па лініі, забясьпечаньня значнай перавагі бядняцкага ядра ў комсамоле. Гэта папершае. Па-другое—нельга стаць на шлях адштурхваньня ад комсамолу маламоцнай серадняцкай моладзі, якая не састаіць на сёньня ў колгасе. І па-трэцяе, мерылам для прыёму ў комсамол, апроч соцыяльных адзнак, павінна быць таксама і ступень удзелу моладзі ў соцыялістычным будаўніцтве і ў барацьбе з кулаком за соцыялістычную перабудову вёскі.

З гэтага пункту погляду формулёўка росту, якую даў тав. Віткоўскі ў члены саюзу прымаецца рабочая, колгасная і батрацка-бядняцкая аднаасобная моладзь — зьяўляецца няверная па двум матывам. Па-першае, гэтай формулёўкай адкідаецца ад комсамолу аднаасобны маламоцны серадняк, прымаюцца ў комсамол толькі аднаасобны батрак і бядняк, а па-другое, ставіцца знак роўнасьці паміж колгасьнікам батраком, бедняком і серадняком. Ва ўмовах Беларусі мы маем толькі нязначную колькасьць такіх раёнаў, дзе колектывізацыя дасягнула 20 і больш процантаў. І нават у гэтых раёнах мы ня можам ставіць пытаньне аб ня прыёме ў комсамол пры пэрсанальным падыходзе маламоцнага серадняка. Адносна прыёму колгасьніка, такая ўстаноўка ў росьце можа давесьці да таго, што асобная работа з бядняцкай моладзьдзю праводзіцца на будзе, і можа здарыцца, што серадняцкая моладзь будзе значна шырэй ахоплена комсамолам, чым бедната. А для саюзу гэта стварае вялікую небясьпеку.

III СЭСІЯ ЦВК БССР

Уступаем у трэці рашаючы год пяцігодкі

Кантрольныя лічбы народнай гаспадаркі БССР на 1931 год—у шырокія масы працоўных

* 11-XII да 2-й гадзіны дня пасяджэньне сэсіі ЦВК было прысьвечана дакладу т. Галадзеда, „Кантрольныя лічбы народнай гаспадаркі БССР на 1931 год“.

* Па дакладу разгарнуліся гарачыя спрэчкі.

* Тав. Муха (Церахаўскі р-н) гаворыць аб тым, што яшчэ да гэтага часу справу ліквідацыі акруг і ўзмацненьня раёнаў не давялі да канца. Раёны чакаюць дапамогі, рашучага палепшаньня ўсёй работы.

* Вось факт—гаворыць т. Муха.—Мы даведаліся, што глеба нашага раёну захоўвае ў сваіх нетрах вялікую колькасьць жалезнай руды. Вузоры жалезнай руды мы павезьлі ў ВСНГБ. Нам сказалі:—руда добрая, у ёй 30 проц. жалеза. Заводы патрабуюць сыравіны, ім неабходны мэталь, а нашы гаспадарчыя органы абяцаюць толькі ў маі месяцы прыехаць да нас і пачаць распрацоўку пакладаў руды.

* У Грэскім раёне,—гаворыць т. Катлінская, —пры правядзеньні колектывізацыі было шмат памылак і перагібаў, але, пад кіраўніцтвам партыі, мы выправілі гэтыя памылкі. Аб гэтым красамоўна сьведчыць той фак, што ўвесну раён быў колектывізаваны на 9,5 пр., цяпер-жа раён колектывізаваны на 13,25 проц.

— У адказ школьнікам і інтэрвэнтам, я дадаткова падпісваюся на 50 рублёў на пазыку „Пяцігодка—у чатыры гады“,—гаворыць у заключэньне сваёй прамовы т. Катлінская—і заклікаю ўдзельнікаў сэсіі пасьледваць майму прыкладу.

* На вылазкі агэнтаў інтэрвэнцыі,—адзначае т. Шустэраў,—пролетарыят і працоўныя масы сялянства адказваюць пасіленьнем барацьбы за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады. У сувязку з перавыбарамі саветаў патрэбна, коб наша вока было як ніколі пільным, бо клясавы вораг не дабіты і імкнецца пралезьці ў органы дыктатуры пролетарыяту.

Тав. Шустэраў у канцы сваёй прамовы гаворыць аб неабходнасьці больш шырокай і інтэнсыўнай барацьбы з бяспрытульнасьцю. З бяспрытульных, пры належным іх выхаваньні, мы атрымаем пролетарскія кадры.

* Работніца фабрыка „Чырвоны Кастрычнік“ (Мазыр), удзельніца сэсіі ЦВК—тав. Шэхтман,—сьледуючы прыкладу т. Катлінскай, дадаткова падпісваецца на пазыку на 50 руб. Пры гэтым яна дадае:—Мне 46 гадоў, і вось нядаўна я ўступіла ў партыю. Гэта мой адказ агэнтам інтэрвэнцыі і беларускім контр-рэволюцыйным нац.-дэмократам.

* Кантрольныя лічбы народнай гаспадаркі БССР на 1931 год,—заяўляе тав. Валодзька,--патрабуюць найхутчэйшай і найшырэйшай популярызацыі. Кантрольныя лічбы ўдарнага кварталу ня былі дасканала прапрацаваны, ня ўсюды былі даведзены да кожнага агрэгата, да кожнага варштата, і якраз цяпер, калі заканчваецца ўдарны квартал, некаторыя прадпрыемствы ня выканалі сваіх прамфінпляну.

Мы ўжо напярэдадні 3-га году пяцігодкі, і таму вялікім недахопам трэба лічыць позьняе складаньне кантрольных лічбаў і вытворчых плянаў. Трэба неадкладна праверыць ці складзены вытворчыя пляны, ці прапрацаваны яны, ці ўвязаны з колумовамі.

* Мы дамагліся, —гаворыць т. Бэрзін,—велізарных посьпехаў толькі дзякуючы правільнаму ленінскаму кіраўніцтву комуністычнай партыі. Энтузіязм працоўных мас, які мы зараз маем, зьяўляецца бясспрэчнай парукай таму, што кантрольныя лічбы 1931 году будуць выкананы і перавыкананы.

* Далей т. Бэрзін застанаўліваецца на пытаньнях барацьбы з контр-рэволюцыйным нацыянал-дэмократызмам. Усім, хто памкнецца ўзьняць крывавы нож, каб параніць ім соцыялістычнае будаўніцтва, усім, хто ў еднасьці з польскім фашызмам рыхтаваў інтэрвэнцыю, хто імкнуўся Савецкую Беларусь ператварыць у калёнію фашызму,—усім ім мы павінны нанесьці зьнішчальны ўдар. Рабочая кляса і працоўнае сялянства Савецкай Беларусі, у адказ выкрытым ДПУ контр-рэволюцыйным нац.-дэмократам, гэтай горстцы буржуазнай інтэлігенцыі—узмацняюць барацьбу за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

* Старшыня пасяджэньня абвяшчае абедзены перапынак.

Мал. Кругера.

Удзельнікі сэсіі: т. т. Шаўханаў (колгасьнік Лепельскага раёну), Грышчанка (колгасьніца Каралінскага раёну).

У ЛЕС, НА ШТУРМ!

Плян лесазагатовак ударнага кварталу на 1-XII выканан па будаўнічаму матар'ялу на 40,3 проц па дровах на 17,9 проц. Барысаўскі Леспрамгас сарваў выкананьне плянаў загатовак. Белкоо саюз зрывае забяспечаньне рабочых харчамі

Пашлем сотні ўдарных комсамольскіх брыгад у лес, выканаем і перавыканаем плян загатовак

Узяць кантроль над забясьпечаньнем рабочых лесазагатовак

(Адкрыты ліст ячэйкі ВСНГБ да комсамольцаў ячэйкі Белкоопсаюзу)

Для ліквідацыі прарываў на лесазагатоўчым фронце (невыкананьне плянаў, недахоп рабочых рук і г. д.) ячэйка ЛКСМБ пры ВСНГБ высунула прапанову перад ЦК ЛКСМБ аб тым, каб уключыць усю комсамольскую організацыю Беларусі ў бой за лесазагатоўкі.

Пастановай бюро ЦК былі організованы брыгады для дапамогі вясковым організацыям комсамолу ў лесазагатоўках. Выехаўшыя брыгадзіры адначасова займаліся і праверкай працы спажывецкай коопэрацыі па забясьпечаньню рабочых лесазагатовак промтаварамі і харчамі.

Работа брыгадзіраў выявіла цэлы шэраг адмоўных бакоў у працы спажыўкоопэрацыі, якія перашкаджаюць пасьпяховаму выкананьню плянаў лесазагатовак. Белкоопсаюз дрэнна організаваў адпраўку прамтавараў па нарадам у раёны лесазагатовак. Напрыклад, Петрыкаўскі раён, атрымаўшы 3 месяцы таму назад нарады на промтавары, яшчэ і дагэтуль іх не атрымаў. У Тураўскі р-н адпраўлены тавары без расцэнак. У гэтым-жа раёне на складах спажыўтаварыства меўся хлеб, а рабочыя лесазагатовак два дні былі без хлеба. Спажывецкія таварыствы ня прынялі належных захадаў, каб наладзіць работу сталовых, а ўсё гэта стварае парушэньне плянавага забясьпечаньня і выклікае зусім справядлівае абурэньне рабочых на лесазагатоўках.

У сувязі з гэтым мы зварочваемся да ячэйкі ЛКСМБ Белкоопсаюзу з прапановай узяць на сябе абавязак зьнішчыць паказаныя недахопы, узяць на грамадзкі буксір работу спажыўтаварыстваў, праверыць работу па забясьпечаньню прамтаварамі і харчамі рабочых лесазагатовак (праверыць выкананьне плянаў забясьпечаньня) сачыць, каб не паўтараліся выпадкі несваячасовага выкананьня нарадаў і г. д.

Аб узятых абавязках і выніках вашай працы просім паведаміць праз газэту „Чырвоная Зьмена".

Ячэйка ЛКСМБ ВСНГБ.

Опортуністычная практыка барысаўскага леспрамгасу

На старонках „Чырвонай Зьмены" ужо ня раз пісалася аб зрыве лесазагатовак у барысаўскім Леспрамгасе. Аднак, гаспадарчыя організацыі ня прынялі энэргічных мер, каб ліквідаваць прарывы.

Згодна плянавага заданьня, барысаўскаму Леспрамгасу патрэбна загатовіць 155.925 к.-м. лесаматар'ялаў і 49000 к.-м дроў, а вывезьці—210325 к.-м. На самой-жа справе плян загатоўкі лесаматар'ялаў выканан на 8647 к-м, што складае 5,4 проц., дроў нарыхтавана—319 к-м, што складае—6,3 проц. Вывезена—693 к.-м, альбо 0'3 проц., і сплаўлена ўсяго 11654 к-м. Прыведзеныя лічбы красамоўна гавораць аб ганебных прарывах, па выкананьню плянаў лесазагатовак.

Невыкананьне плянаў паставіла пад пагрозу нормальны ход работы заводу „Комінтэрн" і ф-кі „Чырвоная Бярэзіна", якім барысаўскі Леспрамгас павінен дастаўляць лесаматар'ял. Прарыў у лесазагатоўках ужо зараз прымусіў фабрыку „Чырвоная Бярэзіна" выкарыстоўваць зімовыя запасы.

Асабліва дрэннае становішча на лесазагатоўках з рабочай сілай. Рабочыя, дзякуючы адсутнасьці ўсялякай культурна-выхаваўчай працы, не зацікаўлены ў выкананьні пляну, сярод іх назіраецца ў вялікіх памерах самавольнае пакіданьне працы. З 20-га па 30-ае кастрычніка працавала 43 чалавекі, з 1-га па 10-ае лістапада—243, з 10-ае па 20-ае лістапада—2723, а з 20-га па 30-ае лістапада—627. Соц. спаборніцтва і ўдарніцтва сярод рабочых лесазагатовак зусім адсутнічае Уплыву профорганізацыі на лесазагатоўках не адчуваецца.

Нельга не адзначыць таго, што і сельскія саветы не зварочваюць ніякай увагі на пасьпяховае праведзеньне лесазагатовак. Сельсаветы не давялі пляны загатовак да вёсак, да двара. Новасельскі, Карсаковіцкі, Глівінскі і інш. сельсаветы да апошняга часу яшчэ ня выкарысталі кулацкіх гаспадарак для трудгужпавіннасьці па вывозцы лесаматар'ялаў. Таксама і колгасы за ўвесь час лесазагатовак ня вывезьлі ніводнага к-м лесаматар'ялаў, а коні ў колгасах пасьля сканчэньня асеньня - пасеўнай кампаніі вольныя.

Нарэшце, райком партыі, РВК і райком комсамолу да апошняга часу ня прынялі энэргічных мер для ліквідацыі прарыву, не мобілізавалі грамадзкасьць навакол задач выкананьня і перавыкананьня плянаў лесазагатовак. Райком комсамолу толькі 12-га лістапада ўпяршыню абгаварыў пытаньне лесазагатовак і задачы комсамолу, і вынес пастанову мобілізаваць 300 комсамольцаў на сталую працу для ліквідацыі прарыву ў лесазагатоўках, мобілізаваць 20 культпрацаўнікоў для культурнага абслугоўваньня лесарубаў і г. д. Але гэтая пастанова засталася на паперы. Ні райком комсамолу, ні комсамольскія ячэйкі палец аб палец ня вытнуць, каб выканаць сваю пастанову.

Неабходна адпаведным органам прыняць рашучыя меры для ўзмацненьня работы ў Барысаўскім раёне па лесазагатоўках.

Гр. Ведаючы.

Працуюць з халадком

Астрашыцкі Гарадок. Пасьля рашэньняў райконфэрэнцыі аб мобілізацыі ўвагі комсамольскай організацыі на выкананьне пляну лесазагатовак, комсамольскія ячэйкі і РК ўзялі ініцыятыву па давядзеньню плянаў лесазагатовак да сельсаветаў, вёсак і двара. РК вынес пастанову мобілізаваць 10 комсамольцаў на сталую працу, заключыў умову з Вучлесгасам—сіламі комсамольскай організацыі і піонэраў сабраць 87,5 тысяч кілё хваёвых і яловых шышак.

Аднак, сваю пастанову і пастанову райконфэрэнцыі райком слаба выконваў. Толькі па прыезьдзе брыгады ЦК ЛКСМБ і ячэйкі ВСНГБ была разгорнута работа па давядзеньню кантрольных лічбаў лесазагатовак да кожнага сельсавету, двара і мобілізаваны 30 чалавек на сталую працу па лесазагатоўках, замест вызначаных па развёрстцы ЦК ЛКСМБ 12-ці.

Брыгада ЦК ЛКСМБ і „ЧЗ"
Новікаў і Смагашэўскі.

На ст. Н.-Беліца ляжыць лесаматар'ял для Донбасу больш, як на 1000 вагонаў. Адміністрацыя станцыі затрымлівае сваячасовую адпраўку.

(З газэт).

Жывы тупік

З фронту лесазагатова[к]

Сьмілаўскі Вучлесгас вык[анаў] плян па загатоўцы будаўнічых [мa]тар'ялаў на 11,8 проц., дроў 1,9 проц. і зусім ня выканаў [пля]ну па вывазцы лесаматар'ялаў.

Райвыканком і сельсаветы [з]усім ня лічаць сябе адказнымі за выкананьне плянаў лесазагатовак, ад[на]ляюцца давесьці лесазагатоўчыя [пля]ны да двара і забясьпечыць вы[воз]ку цягавай сілай.

Райком комсамолу і ячэйкі [да] лесазагатовак нічога не зра[білі]. Пленум райкому, заслухаўшы [ін]формацыю аб ходзе лесазагато[вак], аднёсься афіцыйна. Мобіліза[цыя] комсамольцаў на лесазагатоўкі, [па]водле заданьня ЦК, ня выканана.

Новікаў і Смагашэўскі.

* * *

Вушацкі райком комсамолу [узяў] на сябе абавязак кожны месяц [мо]білізоўваць 20 комсамольцаў на [ле]сазагатоўкі.

Г. Я.

* * *

Халопеніцкі райком комсам[олу] для ліквідацыі прарыву ў вы[ка]наньні пляну лесазагатовак орг[ані]заваў з комсамольцаў і працо[ўнай] моладзі арцель лесарубаў. Мобілі[за]вана 50 комсамольцаў на ста[лую] працу па лесазагатоўках і 5 [ком]самольцаў на працу ў якасьці [ле]сьнікаў.

Ісай.

Ігнаруюць беларусізацы[ю]

У Гомельскім дарожна-бу[даўні]чым тэхнікуме зусім дрэнныя [спра]вы з праведзеньнем нацпол[ітыкі] партыі.

Спэцыяльныя дысцыпліны вык[ла]даюцца на расійскай мове і выкла[д]чыкі іх адмаўляюцца беларус[ізо]вацца. Выкладчык тэхнолёгіі [і] Пятрышын, па нацыянальн[асьці] беларус, гаворыць:—„Мы не бе[ла]русізуемся таму, што бываем у [ін]ных рэспубліках і вывучаць [ін]ныя мовы, у прыватнасьці бела[рус]кую, няма ніякай магчымасьці".

Такія гутаркі дапамагаюць ак[ты]візацыі вялікадзяржаўнага шові[ніз]му і сярод студэнтаў

Студэнт I сэмэстру Аніш[чы]к гаворыць:—„Беларускай мовы да [рэ]волюцыі ня было, яна была ад[ку]шай. Можна вышукаць і ін[шую] якую мову і прымусіць яе вы[ву]чаць".

Студэнт I сэмэстру Панамар[оў] шуча адмовіўся ад беларусіза[цыі] як і ад грамадзкай працы, за [што] быў выведзен з складу профс[аюзу].

Нацопортунізм праяўляецца [ў] пасыўным супраціўленьні белар[усі]зацыі, маруднасьці яе правядзеньн[я]. Беларускую мову студэнты вы[ву]чаюць два-тры гады, але гавор[аць] больш на расійскай мове, чым [на] беларускай.

Праявы вялікадзяржаўнага [шо]вінізму ёсьць вынік дробна-бур[жу]азнага ўплыву на няўстойлі[вую] частку студэнтаў. Слабая палі[тыч]на-выхаваўчая праца, адсутн[асьць] рашучай барацьбы з ухіламі ад [нац]політыкі партыі даюць магчымась[ць] бесьперашкоднаму існаваньню [вялі]кадзяржаўнага шовінізму.

Культэстафэта не праводз[іцца]. Студэнты абвясьцілі сябе культ[эста]фэйцамі, але-ж імі ніхто ня кір[уе].

Ячэйка ЛКСМБ і профком па[він]ны ўзьняць на вышэйшую ступ[ень] працу па ажыцьцяўленьню ў тэх[ні]куме нацполітыкі партыі.

Брыгадзір „Ч. З."—Чырво[...]

Усім савгасам уключыцца ў сьвінаводчую эстафэту

Выключнай важнасьці задачы, пастаўленыя партыяй і урадам у галіне разьвіцьця сьвінаводчых гаспадарак, як соцыялістычных фабрык мяса, каб у асноўным вырашыць мясную проблему, патрабуюць сапраўднай мобілізацыі сіл і ўвагі ўсёй савецкай грамадзкасьці і ў першую чаргу рабочых колектываў, якія непасрэдна іх ажыцьцяўляюць. Гэтыя задачы патрабуюць максімальнай мобілізацыі сіл профэсыянальных, комсамольскіх і партыйных організацый, пераключэньня на сапраўды ўдарныя мэтады работы, разгортваньня соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Падводзячы вынікі нашай работы на сёньня, мы павінны прызнаць, што маем недавыкананьне плянавага заданьня па яго асноўных паказчыках. Заданьне па ўкомплектаваньню савгасаў сьвінаматкамі ў сярэднім выканана на 76 проц., па будаўніцтву сьвінарнікаў — на 47 проц., зоовэтмінімум выконваецца савгасамі вельмі дрэнна, наглядаецца вялікі адыход маладняка, што выклікае пагрозу невыкананьня пляну па здачы таварнай продукцыі і наносіць велізарныя страты нашым гаспадаркам.

Такое становішча тлумачыцца тым, што цэлы шэраг савгасаў яшчэ недаацаніў політычна-гаспадарчай важнасьці проблемы хутчэйшага разьвіцьця сьвінагадоўлі. Рабочыя колектывы, профорганізацыі, комсамольскія ячэйкі яшчэ ня поўнасьцю мобілізавалі сілы на пераманьне цяжкасьцяй, якія стаяць на шляху вырашэньня пастаўленых партыяй задач, у савгасах яшчэ не адчуваецца сапраўднай барацьбы за выкананьне зоовэтмінімуму, барацьбы з падзяжом і з іншымі стратамі. Сапраўднае соцспаборніцтва і ўдарніцтва амаль зусім не разгорнуты.

Зараз мы ўступаем у новы пэрыод работы—складаньня прамфінпляну для кожнай савецкай гаспадаркі. Па свайму значэньню, гэта —адна з важнейшых політычных кампаній, за ходам якое сочыць уся савецкая грамадзкасьць і ў працы якое павінны прыняць актыўны удзел усе рабочыя савгасаў.

Падтрымліваючы дадзеную комсамолам ініцыятыву аб праведзеньні сьвінаводчай эстафэты, якая мае на мэце падняць масы на барацьбу за выкананьне дырэктыў партыі і ураду па разьвіцьцю сьвінагадоўлі, на выкананьне плянаў укомплектаваньня, заканчэньня будаўніцтва сьвінарнікаў, праведзеньня зоовэтмінімуму, на барацьбу з падзяжом і адыходамі маладняка, за сапраўды соцыялістычную арганізацыю працы ў савгасах (падрабязнасьці аб эстафэце глядзі ў газэце „Чырвоная Зьмена" ад 6-XII 1930 г.), —лічым неабходным усім савгасам ўключыцца ў праведзеньне сьвінаводчай эстафэты і сумесна з комсамолам ісьці да фінішу к X зьезду ЛКСМБ. Фініш эстафэты ў вашым савгасе павінен падсумаваць вашы работы ў поўным іх аб'ёме з удзелам усіх організацый па выкананьню задач партыі і ўраду па сьвінагадоўлі. На агульных сходах сумесна з комсамолам заслухайце даклады дырэктароў савгасаў, сэкратароў комсамольскіх ячэек у напрамку: што зроблена для належнай організацыі сьвінагадоўлі ў вашым савгасе, як выконваецца плян укомплектаваньня, ход будаўніцтва сьвінарнікаў, выкананьне зоовэтмінімуму, як праходзіць случная кампанія, рацыянальная організацыя працы на сьвінарніках, вынікі соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

На вытворчых нарадах, з далейшым вынясеньнем на агульныя сходы, прапрацаваць конкрэтныя мерапрыемствы, як-я-б забясьпечылі найхутчэйшую ліквідацыю прарываў па сьвінагадоўлі ў вашым савгасе, далі-б магчымасьць як найхутчэй выканаць пастаўленыя перад вамі задачы.

Праведзеньне эстафэты павінна спадарожнічаць разгортваньне соцспаборніцтва сярод рабочых вашага савгасу, заключэньне ўмоў з другімі савгасамі, організацыя новых сапраўды ўдарных брыгад, мобілізацыя ўсяго рабочага колектыву на барацьбу за прамфінплян і на сустрэчны прамфінплян. Вынікі вашай работы ў выглядзе рапартоў ячэек ЛКСМБ і савгасаў з дэлегацыяй з лепшых комсамольцаў і рабочых ударнікаў дасылайце ў раёны райкомам партыі, РВК, райкомсамолу (аб далейшым руху эстафэты чытайце „Чырвоную Зьмену" ад 6-XII 1930 г.).

Прадстаўнікі, якія камандыруюцца для перадачы эстафэты ў раён, атрымліваюць сутачныя і праязныя на агульных падставах па камандыроўках

Аб ходзе эстафэты ў савгасах, у раёнах, аб усіх дасягненьнях і недахопах інформуйце друк. Эстафэта павінна стаць шырокім рухам мас за выкананьне задач партыі і ўраду па сьвінагадоўлі.

Сьвінатрэст Гарыленкаў.

На шляху да X зьезду ЛКСМБ

Шырэй прадзьездаўскі заклік

Шэраг камітэтаў і ячэек ЛКСМБ яшчэ да гэтага часу не разгарнулі прадзьездаўскага закліку ў комсамол

Па-баявому выканаць задачу стопроцантнага ўцягненьня ў комсамол рабочай і батрацкай моладзі

Вынік баявой работы

Комсамольскі колектыў чырвонаштандартнага машынабудаўнічага заводу „Энэргія“ у выніку сыстэматычнай працы сярод беспартыйнай рабочай моладзі заводу па ўцягненьню яе ў комсамол, мае прыліў у шэрагі КСМ 75 асоб рабочай моладзі.

У падарунак IX і X зьездам, па ініцыятыве комсамолу „Энэргія“ арганізаваны новыя комуны і ўдарныя брыгады.

У кацельным цэху—2 комуны імя X зьезду, у модэльным—адна комуна, у такарным—дзьве ўдарныя брыгады.

4 сьнежня, па ініцыятыве піонэратраду заводу, у падарунак X зьезду, быў наладжан карнавал пад лёзунгам: „за выкананьне промфінпляну і барацьбу з прагульшчыкамі“. Карнавал меў вялікі посьпех сярод рабочых заводу.

5 сьнежня комсамольскі колектыў наладзіў мітынг усяго маладняка заводу, дзе стаяла пытаньне аб задачах IX і X зьездаў.

Комсамолія ўзьняла пытаньне аб арганізацыі да X зьезду выстаўкі праку.

Пытаньне аб задачах IX і X зьездаў прапрацоўваліся на агульных сходах комсамольскіх цэхавых ячэек.

І. Я. Гельфанд.

„Батракі ня ідуць“

Камсамольская ячэйка ЛКСМБ м. Дукоры (Сьмілавіцкі раён) ніякай працы сярод батракоў Дукорскага сельсавету, якіх налічваецца звыш 65, не вядзе. Ячэйка галоўным чынам расьце за лік вучнёўскай моладзі, Дукорская ячэйка вырасла на 15 чалавек, з якіх няма ніводнага батрака, а толькі вучні і студэнты. Сэкратар ячэйкі, В. Рэдзька, на запытаньне чаму ячэйка сярод батрацкай і колгасной моладзі не вядзе ніякай працы па ўцягненьню яе ў шэрагі комсамолу, адказвае:—„Нам толькі-б расьці, батракі ня ідуць у комсамол“. Гэтую думку ўсе комсамольцы Дукорскай ячэйкі ЛКСМБ павінны рашуча асудзіць і даць па руках тым, хто скрыўляе лінію ўзросту КСМ

П. Лявіцкі.

Сэкратар Дукорскай ячэйкі: Задача ўцягненьня ў комсамол рабочай і батрацкай моладзі для нас непасільная задача. Маючыяся ў нашым сельсавеце 65 батракоў ня ідуць у комсамол.

Разгортваем прадзьездаўскі набор у КСМ

Пасьля таго, як РК ЛКСМБ высунуў сустрэчны плян падрыхтоўкі да комсамольскіх зьездаў і абвясьціў набор рабочай і батрацкай моладзі ў комсамол імя 10-га зьезду ЛКСМБ, маецца вялізарны зрух у росьце Лёзьненскай арганізацыі КСМ. У некаторых ячэйках КСМ („Прогрэс“) адразу прымаюць па 10-15 асоб батрацкай, бядняцкай, колгасна-бядняцкай і серадняцкай моладзі ў шэрагі комсамольскай організацыі. У раёне організоўваюцца новыя комсамольскія ячэйкі. Праца з батрацкай, бядняцкай і колгаснай моладзьдзю пачынае разгортвацца, што ўжо зараз дае значны пералом у росьце організацыі.

К. Кароль.

Факты росту актыўнасьці

Нядаўна 12 чалавек рабочай моладзі саўгасу „Чырвоны Маяк“ Быхаўскога раёну падалі колектыўную заяву аб уступленьні ў шэрагі КСМ. У гэтай заяве яны пішуць: „У адказ на правааппортуністычныя паклёпы, выступленьні тыпу Бутыркіных і Целешавых аб крызісе ў КСМ організацыі, мы ўступаем у шэрагі КСМ“. У сувязі з надыходзячым зьездам маецца цэлы шэраг фактаў масавага ўступленьня рабочай моладзі ў КСМ.

Бюро Быхаўскага РК пастанавіла —організаваць у саўгасе „Чырвоны Маяк“ комсамольскую ячэйку.

Фіалкін.

Да ведама рабкораў і юнкораў Менску

Сёньня ў памяшканьні рэдакцыі газ. „Зьвязда“ (Савецкая, 63, 3 паверх), а 7 гадз. увечары

адбудзецца СХОД РАБКОРАЎ МЕНСКУ

НА ПАРАДКУ ДНЯ:

Інформацыя прадстаўніка ВСНГБ аб ходзе выкананьня промфінпляну ўдарнага кварталу, у сувязі з генэральнай праверкай работы прадпрыемстваў

Запрашаюцца ўсе рабкоры шматтыражак і насьценгазэт

Высоўваю на абгаварэньне

Нам патрэбен устаў ударнікаў соцыялізму

„Той комсамолец, які ня хоча быць ударнікам, ігноруе соцспаборніцтва, не павінен быць у шэрагах організацыі“. (З пастановы ЦК УсеЛКСМ ад 4 верасьня).

Права на комсамольскі білет мае толькі ўдарнік

„Членам УсеЛКСМ лічыцца усякі ва ўзросьце ад 14 да 23 год, які прызнае програму і ўстаў саюзу, працуе ў аднэй з яго організацый, падпарадкаецца ўсім пастановам саюзу і плаціць членскія ўзносы“.

Ці можна зараз лічыць усякага членам УсеЛКСМ, ці можна зараз абмяжоўвацца гэтымі патрабаваньнямі да комсамольца, да кожнага ўступаючага ў соцыялізм.

Не.

Соцыялізм наступае па ўсім фронце. Паднятае ініцыятывай комсамолу соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва сталі сыстэмай працы мільёнаў рабочых і колгасьнікаў, сталі мэтодам рашучага клясавага наступленьня. Ударніцтва ў цэху, у колгасе, за прылаўкам, у школе, ва ўстанове. Ударніцтва захоплівае ўсё большыя масы.

Ударніцтва—абавязак

„Кожны комсамолец—ударнік“—зараз ужо ня лёзунг, а абавязак. Сапраўднае ўдарніцтва—гэта права на званьне комсамольца, куды большае права, чым білет.

І вось гэтае права патрэбна замацаваць ва ўставе. Устаў УсеЛКСМ, зацьверджаны 7-м усесаюзным зьездам, не адбівае ўдарніцтва, не адбівае новых этапаў клясавай барацьбы. Яго далёка перагнала жыцьцё.

Дзеля гэтага ўсе пункты ўставу трэба працізаць ударніцтвам, зрабіць сапраўднае ўдарніцтва першым абавязкам комсамольца, куды большым па політычнаму значэньню, чымся уплата узносаў, альбо наведваньне сходаў.

Мы прапануем на абгаварэньне 9-га зьезду УсеЛКСМ наступныя папраўкі да ўставе комсамолу.

Першы пункт запісаць так:

„Членам УсеЛКСМ лічыцца ўсякі працоўны-ўдарнік ва ўзросьце ад 14 да 23—год, які давёў сапраўды ўдарнай работай у цэху, на заводзе, у колгасе, установе, школе адданасьць партыі і рэволюцыі, які прызнае програму і ўстаў саюзу, які працуе ў аднэй з яго організацыі, падпарадкаецца ўсім пастановам саюзу, і плаціць членскія ўзносы“.

У саюз прымаць толькі ўдарнікаў.

У пэрыод суцэльнай колектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як клясы, слова „сялянская моладзь“, як гэта зараз запісана ва ўставе, ня годна для азначэньня савецкай вёскі. Мы на практыцы даўно падыходзім па рознаму да прыёму ў саюз батрацкай, серадняцкай і заможнай моладзі. А ў пункце 2-м уставу аб парадку прыёму ўсё яшчэ захоўваецца „агульнае“ вызначэньне:

„а) у члены саюзу прымаецца рабочая і сялянская моладзь без кандыдацкага стажу і рэкомэндацыі“.

Каго і як прымаць у саюз?

Мы прапануем параграф 2-гі зьмяніць так:

„б) у члены саюзу прымаецца рабочая, колгасная і батрацка бядняцкая аднаасобная моладзь без кандыдацкага стажу і рэкомэндацыі“.

Увага: Вучні дзеці рабочых і колгасьнікаў, раней працаваўшыя на вытворчасьці ці сельскай гаспадарцы, ва ўзросьце да 18 год прымаюцца ў саюз таксама без кандыдацкага стажу і рэкомэндацыі.

б) у кандыдаты саюзу прымаюцца вучні непролетарскага паходжаньня, служачыя і іх дзеці“.

Далей прапануем дадаць новы пункт:

„в) у члены і кандыдаты саюзу прымаюцца толькі ўдарнікі. Ударнікі ў цэху, у колгасе, у коопэратыве, у школе і г. д., улічваючы пры гэтым соцыяльнае становішча прымаемага“.

Гэты пункт падымае званьне комсамольца на яшчэ большую політычна-прынцыповую вышыню. Быць членам саюзу маладых бальшавікоў—значыць быць сапраўдным ударнікам, будаўніком соцыялізму. Інакш ня можа ставіцца пытаньне ў эпоху напружанай будоўлі соцыялізму.

Больш праў і адказнасьці колектывам УсеЛКСМ

Паварот саюзу тварам да гаспадарча-політычных задач, перабудова саюзнай работы павысілі ролю колектыва УсеЛКСМ. Першае аб'яднаньне ячэек—фабрычнага, заводзкага і вясковага колектываў—павінна па ўставу атрымаць больш праў і адказнасьці.

Задача стопроцантнага ўцягненьня рабочай і колгаснай батрацка-бядняцкай моладзі ў комсамол патрабуе скараціць да мінімуму інстанцыі прыёму. У практыцы сельскіх і гарадзкіх організацый ёсьць шмат выпадкаў, калі заявы аб прыёме залежваюцца ў райкомах месяцамі. Гэта адштурхвае моладзь ад комсамолу.

Выходзячы з гэтых двух меркаваньняў, мы прапануем перадаць права канчатковага зацьверджаньня прыёму ў саюз рабочых і колгасьнікаў-батракоў і беднякоў—фабрычна-заводзкім і вясковым колектывам УсеЛКСМ. Пункт „с“ параграфу 2-га ўставу патрэбна зьмяніць так:

„а) пытаньне аб прыёме ў члены і кандыдаты саюз у папярэдня разглядаецца агульным сходам ячэйкі. Прыём рабочых і колгасьнікаў-батракоў, беднякоў—канчаткова зацьвярджаецца фабрычна-заводзкімі ці вясковымі камітэтамі УсеЛКСМ. Пытаньне аб прыёме ўсіх астатніх катэгорый уносіцца ячэйкай на зацьверджаньне райкому“.

Выключыць сабатажнікаў ударніцтва

Выключэньне з саюзу ў многіх організацыях праходзіць тэхнічна. Такі мэтад „аздараўленьня“ апашляе званьне комсамольца, выключэньне губіць сваю мобілізуючую сілу.

Зараз кожнае выключэньне павінна быць ня простым выкрасьленьнем сьпіску, а сродкам політычнага выхаваньня і мобілізацыі мас на ажыцьцяўленьне пяцігодкі.

Дзеля гэтага 4-6 пункты ўстава аб выключэньні мы прапануем зьмяніць:

Каго і за што выключыць з саюзу?

Пастанова ЦК УсеЛКСМ ад 4-га верасьня ясна гаворыць:

„Той комсамолец, які ня хоча быць ударнікам, ігноруе соцспаборніцтва не павінен быць у шэрагах організацыі“.

Гэтае рашэньне павінна быць пунктам уставу. Выключаць з саюзу патрэбна ў першую чаргу чыноўнікаў з комсамольскім білетам у кішэні, якія не жадаюць працаваць ударна, выключаць ілжэўдарнікаў, якія за левай фразай захоўваюць права-опортуністычную практыку.

Барацьба за пяцігодку паказала што баластам для саюзу зьяўляюцца ня толькі тыя, хто прапусьціць тэрмін уплаты членскіх узносаў, ці не наведае 4 сходаў, баласт тыя, хто ўсе свае абавязкі перад комсамолам укладае ў марку акуратна ўплачаных узносаў.

Мы прапануем 4 пункт сформуляваць так:

„Выключэньне з саюзу можа пасьледаваць за парушэньне програмы і ўставу УсеЛКСМ за адмаўленьне ад соцспаборніцтва і ўдарніцтва, за ілжэ-ўдарніцтва, за невыкананьне промфінпляну, за парушэньне дысцыпліны саюзу і за ўчынкі, якія грамадзкай думкай саю у прызнаюцца злачыннымі.

Чотка вызначыць ролю КК.

Практыка работы раённых конфліктных камісій Усе ЛКСМ паказвае, што яны яшчэ недастаткова змагаюцца за клясавую баяздольнасьць і чыстату шэрагаў саюзу. Неабходна ва ўставе, у пункце 5-м аб выключэньні, чотка вызначыць ролю конфліктных камісій.

Мы прапануем пункт 5-ы сформуляваць так:

„Выключэньне з саюзу робіцца па пастанове агульнага сходу ячэйкі УсеЛКСМ, членам якое даны таварыш зьяўляецца ці па рашэньню раённай конфліктнай камісіі, і пацьвярджаюцца райкомам пасьля чаго яно ўступае ў сілу. Пастанова аб выключэньні можа быць абскарджана ў вышэйшыя органы саюзу, аж да ЦК.“

У гады соцыялістычнай пяцігодкі ня толькі комсамольцы, а і ўсе рабочыя, колгасьнікі павінны быць ударнікамі. А комсамольцы павінны быць організатарамі ўдарных брыгад.

Мы за ўстаў ударнікаў соцыялізму. Гэтыя прапановы па першаму разьдзелу ўставу саюзу—„прыём і выключэньне членаў саюзу“—выносім на шырокае абгаварэньне мас комсамольцаў і ўсёй моладзі,—на абгаварэньне X і IX-га зьездаў КСМ.

Пяцісотнік Ф. ВІТКОЎСКІ.

* * *

Зьмяшчаючы артыкул т. Віткоўскага рэдакцыя карэнным чынам ня згодна з шэрагам прынцыповых установак т. Віткоўскага ў пытаньнях апрэдзяленьня апошнім далейшага кірунку росту КСМ організацыі, і патрабаваньня зьмены ў суадпаведнасьці з гэтым устава КСМ.

Не паглыбляючыся зараз у справу ўсебаковага аналізу спрэчных прапаноў Віткоўскага, якія блытаюцца, лагічна не надпарадкаваны адна другой, рэдакцыя, аднак, робіць наступную прынцыповую заўвагу:

Прапанову т. Віткоўскага, праўда ў завуаліраваным выглядзе, здымаюць з парадку дня па-сутнасьці востра-актуальную, баявую задачу комсамола аб 100 проц. уцягненьні ў комсамол рабочай і батрацкай моладзі, што бязумоўна яўна супярэчыць лініі саюзу.

Разам з гэтым рэдакцыя, ставячы на абгаварэньне артыкул Віткоўскага, ч а к а е ад кіруючага КСМ актыву, юнкораў водгукаў па сутнасьці закранутых пытаньняў.

Рэдакцыя.

ВЫ НА ПОУДАРОЗЕ, ПРОФЭСАР!

Прызнаючы асобныя нацыянал-дэмократычныя памылкі, проф. Піотуховіч усё-ж ня выкрыў усё іх варожай сутнасьці і ня даў разгорнутай, жорсткай крытыкі свайго нац.-дэмократычнага credo

Мы чакаем ад проф. Піотуховіча выкрыцьця ўсёй шкоднасьці і варожай сутнасьці сваіх нацыянал-дэмократычных памылак

Ліст у рэдакцыю газэты „Чырвоная Зьмена“

У нумары 267 „Чырвонай Зьмены“ ад 20-га лістапада надрукаваны артыкул „нацыянал-дэмократычнае credo проф. Піотуховіча“.

З повааду данага артыкулу лічу сваім абавязкам давесьці да ведама савецкай грамадзкасьці наступнае:

У першыя гады сваёй працы ў Менску (1921-22) я сапраўды знаходзіўся пад пэўным уплывам нацыянал-дэмократычнай ідэолёгіі, выразам чаго служыць, напрыклад, мой артыкул „Якуб Колас як нацыянальны беларускі поэта“ і мая прамова на выпуску беларускіх лектарскіх курсаў („Адраджэньне“, 1922, стар. 219—230 і 297—299).

У далейшым я, усьвядоміўшы політычную шкоднасьць нацыянал-дэмократызму, паступова пачаў адыходзіць ад яго.

Кніга „Нарысы беларускай літаратуры“ была напісана мной у 1926 г. (надрукавана яна толькі ў 1928 г. з прычыны цяганіны ў БДВ); у час напісаньня „Нарысаў“ суб'ектыўна я амаль цалкам ужо адыйшоў ад нацыянал-дэмократычнай ідэолёгіі, але об'ектыўна тым ня менш некаторыя ўплывы яе адбіліся ў маёй кнізе.

Мне ў сваёй рабоце па беларускай літаратуры, за адсутнасьцю іншых крыніц, мімаволі прыходзілася апірацца на немарксысцкія працы па гісторыі Беларусі. Сам я ў тыя часы, не ўладаючы марксысцкім мэтадам, стаяў на позыцыях эклектычнага соцыялёгізму.

Адсюль, як у „Нарысах“, гэтак і ў іншых маіх працах (напр., гл. даклад на Акадэмічнай Конфэрэнцыі ў 1926 г) узьнікаюць істотныя недахопы:

1. Ухіл у бок голага эмпірызму.
2. Вузкі і аднабаковы экономізм.
3. Адсутнасьць яскравага аналізу клясавай сутнасьці беларускіх пісьменьнікаў, асабліва нашаніўцаў, як, напр., Цётка, Гарун.
4. Недастатковае ўлічваньне момантаў клясавай барацьбы, як асноўнай рухаючай сілы літаратурнага процэсу.

Гэтыя галоўныя заганы мэтодолёгічнага парадку ў сваю чаргу парадзілі ў мяне некаторыя ўхілы ў бок нацыянал-дэмократызму: мной бяз крытыкі ўзята ў гісторыкаў тэорыя барацьбы двох капіталаў на Беларусі; абмінута роля РСДРП ў рэволюцыі 1905 г.; бязгрунтоўна надаецца актуальнасьць рэакцыйнай творчасьці Багушэвіча, робіцца ў пэўных момантах пераацэнка літаратурнай дзейнасьці Цёткі і Гаруна, надаецца невыстарчальнае і аднабаковае акрэсьліваньне нацыянальных адзнак і г. д.

Я безгаворачна прызнаю ўсе паказаныя памылкі, рашуча асуджаю іх, як шкодныя, і цалкам адмяжоўваюся ад іх, уважліва імкнучыся выпраўляць іх у сваёй пэдагогічнай і літаратурнай працы (гл., напр., мае артыкулы: „Белорусская литература Октябрьского периода, „Революция и Культура“ 1929 г., № 1.; „Пути белорусской литературы“, „Сборник белорусской поэзии“, Москва, 1930 г.).

Але, згаджаючыся з адпаведнымі палажэньнямі, выказанымі ў артыкуле „Чырвонай Зьмены“, я лічу патрэбным зазначыць, што часткова ў некаторых момантах яго ёсьць значныя пераўвялічэньні і аднабаковы падыход да „Нарысаў“: аўтар артыкулу старанна абыходзіць і замаўчвае ўсё тое, што ў маёй кнізе супярэчыць нацыянал-дэмократычнай ідэолёгіі і нават яго ўласным сьцьвярджэньням. У прыватнасьці:

1) У мяне зусім адсутнічае мэтафізычнае разуменьне нацыі, як „законсэрваванай нярухомасьці“; я ня толькі „не адмяжоўваюся ад тав. Сталіна“ у яго разуменьні нацыі, як гістарычнай катэгорыі, а, наадварот, спасылаюся на яго азначэньне данага парадку, падаючы наступную цытату з яго працы: „Нацыя зьяўляецца ня проста гістарычнай катэгорыяй, але гістарычнай катэгорыяй пэўнай эпохі, эпохі ўзрастаючага капіталізму. Процэс ліквідацыі фэўдалізму і разьвіцьця капіталізму зьяўляецца ў той-жа час процэсам складваньня людзей у нацыі“ („Нарысы“, ст. 93).

2) Беспадстаўна тэндэнцыйным зьяўляецца закід мне, што я „смакую Багушэвіча“, як прыхільніка вялікадзяржаўнай Беларусі, „калі не з фашысцкай Літвой, дык з фашысцкай Польшчай“... Наадварот, я, падаўшы ўрывак з „прадмовы“ Багушэвіча, які цытуе і аўтар артыкулу, ацэньваю лятуцеьні Багушэвіча аб Беларусі даўно мінулага, у складзе Польшчы „ад мора да мора“, як „бязгрунтоўную романтыку“. Ускрыўшы клясавыя карэньні гэтай романтыкі, я далей зазначаю: „Як зачараваны рыцар, праспаўшы цэлае сталецьце, Багушэвіч і пад сьвіст фабрычных гудкоў усё яшчэ марыць аб сваёй пекнай даме сэрца—Беларусі даўно мінулага, забываючыся, што кола гісторыі не можна павярнуць назад“ („Нарысы“, стар. 95).

3) Не адмаўляючы момантаў пэўнай пераацэнкі Цёткі і Гаруна як барацьбітоў, я тым ня менш далёкі быў ад суцэльнай іх ідэалізацыі. Напрыклад, зазначыўшы, што творчасьць Цёткі „адбівае сярэдні пласт параўнальна заможнага насельніцтва“, я ўскрываю ідылічна-эстэтычны кірунак яе поэзіі (стар. 131), „Маркотныя ноты пыцьця і шкадаваньня па асабістых уцехах“; мной акрэсьлена яе пераварочаньне „у нудную чайку, якая стогне і енчыць перад бурай“. (Ст. 138).

Гэтак сама і ў творчасьці Гаруна я констатую „адарванасьць песьняра ад грамадзкага жыцьця і працоўных мас“, угледаю ў яго творчасьці ўпадніцкія настроі містыкі, безнадзейнага гамлетызму і інш. Мной не абмінуты і факты контр-рэволюцыйнай чыннасьці Гаруна ў яго барацьбе з Савецкай уладай; у „Нарысах“ зазначана: „Нацыяналізм штурхнуў Гаруна на памылковы шлях супрацоўніцтва з урадам окупантаў“. (Стар. 170). Праўда, даныя факты я падаю ў роўніцы біографічнай, але ў самай творчасьці Гаруна я і ня мог ускрыць яго антысавецкіх настрояў, паколькі ў маю задачу ўваходзіла разгледзець толькі нашаніўскі пэрыод яго поэзіі. (1907—1914).

Моманты крытычнай ацэнкі адмоўных бакоў у творчасьці беларускіх пісьменьнікаў ёсьць і ва ўсіх іншых разьдзелах кнігі (Дунін-Марцынкевіч, Чачот Багдановіч і г. д.). Такі крытычны падыход цалкам супярэчыць установіцы нацдэмаўскіх крытыкаў, якія зазвычай давалі аб беларускіх пісьменьніках толькі спляшныя панэгірыкі (Дзяржынскі, Гарэцкі, Касьпяровіч і інш.).

Такім чынам у „Нарысах“ сапраўды ёсьць пасобныя выказваньні у нацыянал-дэмократычным духу,— выказваньні, якія большай часткаю зьявіліся ў выніку маіх некрытычных адносін да прац па гісторыі Беларусі. Але я катэгорычна адмаўляю, што даная кніга ў цэлым і па агульнай сваёй установіцы ёсьць выяўленьне нейкага нацыянал-дэмократычнага „credo“, гэта значыць пэўнай сыстэмы вераваньняў і пераконаньняў.

Непасрэдным довадам адсутнасьці ў мяне такога „credo“, могуць служыць і тыя вядомыя факты, што я, якраз пачынаючы з 1926 г., увесь час быў прадметам цкаваньня з боку нацыянал-дэмократаў і якраз у іх лягеры маю кнігу „узялі ў штыкі“.

Проф. Піотуховіч

„Чырвоная Зьмена“ дапамагла

* Рагачоўская РКК РСІ паведамляе, што заметка „Да суровай адказнасьці заціскачоў сама-рытыкі“ пацьвердзілася. Старшыня прафкому Хількевіч зьняты з працы і прыцягнуты да парт. адказнасьці.

* Заг. Бялынкавіцкай ШКМ Касьцюковіцкага раёну паведаміў, што па заметцы „Уцекачы з фронту колектывізацыі“ 2 падбухторшчыкі вучняў выключаны з школы.

* Нараўлянская РКК РСІ паведамляе, што заметка „Праца Міхалкаўскай крамы“ пацьвердзілася. Заг. крамы Каўбасін зьнімаецца з працы.

* Па допісу „Газэты ў архіве“ факты пацьвердзіліся, аб чым сам заг. хаты-чытальні т. Жураўлёў прызнаўся на прэзыдыуме Жыткав. РВК. Т. Жураўлёў абяцаў выправіць гэтыя недахопы.

* На допіс „Дачка контррэволюцыянэра прынята ў Менскі Белпэдтэхнікум“ паведамляюць, што Мікеша Людвіга Лявонава з тэхнікуму звольнена, як дачка контррэволюцыянэра, высланага за межы БССР.

Ня толькі прызнаваць асобныя памылкі, але разгарнуць глыбокую крытыку іх нацыянал-дэмократычнай сутнасьці

Рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“ лічыць, што вышэйпададзены адказ профэсара Піотуховіча на артыкул тав. Вязіна: „Нацыянал-дэмократычнае credo проф. Піотуховіча“ ня можа задаволіць савецкую грамадзкасьць. Па-першае—проф. Піотуховіч згаджаецца толькі з тымі памылкамі, якія выкрыты ў артыкуле тав. Вязіна, але-ж газэтным артыкулам, як і гэтым адказам нельга вычэрпаць усёй концэпцыі, выкладанай аўтарам у „нарысах гісторыі беларускай літаратуры“. Артыкул толькі прасьледваў вельмі вузкую мэту—сыгналізаваць аб маючымся прарыве на фронце беларускага літаратуразнаўства. Проф. Піотуховіч упарта маўчыць і не дае належнай крытыкі такім нацыянал-дэмократычным установам:

а) „Ідыёвы бок літаратурнай спадчыны Багушэвіча асабліва звачвае на сябе ўвагу ў наш час, калі пролетарскай рэволюцыяй (рэд.) закладваюцца моцныя падваліны культурна-нацыянальнага і соцыяльнага адраджэньня Беларусі. У думках Багушэвіча, песьняра гэтага адраджэньня, можна выявіць першапачатковае зараджэньне, так сказаць, эмбрыон тых ідэалаў, якія зьяўляюцца **баявымі лёзунгамі сёньнешняга дню. Так пытаньне аб Багушэвічу набывае для нас ня толькі гістарычнае, але і сьціслае актуальнае значэньне** (рэд.) („Нарысы“, стар. 185).

б) ... „Янка Лучына верыць у моц навукі; навука сваім сьвятлом разгоніць цёмныя хмары нядолі; яна—парука лепшай долі дзетак патомных. Гэта залатыя словы нашага поэты: яны ствараюць сабой сьцяг, пад якім павінна разьвівацца і соцыяльна-нацыянальнае адраджэньне Беларусі“ („Нарысы“, 117 стар.).

З пададзеных вытрымак відаць, што проф. Піотуховіч адкідае нашае соцыялістычнае будаўніцтва, нашу культуру, па форме нацыянальную, а па зьмесце соцыялістычную. Ён ідзе пад сьцяг нацыянал-дэмократаў Багушэвіча, Лучыны і „Нашай Нівы“, якая працягвае пасьлядоўна ідэі гэтых песьняроў і аб якой проф. Піотуховіч замоўчвае. Проф. Піотуховіч у сваім адказе кажа, што ён адзначыў адмоўныя бакі ў творчасьці Багушэвіча „і ўскрыў клясавыя карэньні гэтаму“.

„У вёсцы, дзе выхоўваліся Янка Купала, Якуб Колас ды інш. песьняры Беларусі, жыцьцё цякло павольна, адліўшыся ў пэўныя рамкі, закасьцянеўшы ў рамках традыцый таго быту, што вякамі складаўся“. („Нарысы“, 194 стар.).

Ня толькі „недастатковае ўлічваньне момантаў клясавай барацьбы“, але і ўпартае яе ігнараваньне. Калі пададзеныя разважаньні адносяцца да пэрыоду паміж дзьвюх рэволюцый (1905—1917 г. г.), дык што можна сказаць аб тых часох, на якія выпадае дзейнасьць Багушэвіча. Проф. Піотуховіч зьяўляецца сучасьнікам пэрыоду з 1905 да 1917 г. і, ня лазячы за спраўкамі ў нац. дэмократычныя маліцьвенікі, мог бачыць сваімі ўласнымі вачыма, як сялянства ў гэты час руйнавала ня толькі маёнткі абшарнікаў, але і кулакоў, а ў проф.—„тишь и благодать“. Без належнага ўскрыцьця клясавай сутнасьці творчасьці Багушэвіча і об'ектыўнай соцыялёгічнай ацэнкі яго творчасьці, проф. Піотуховіча прывяло, як аўтар кажа, да „смакаваньня“ прадмовы і творчасьці Багушэвіча.

Па-другое—рэдакцыя мела мажлівасьць пазнаёміцца з адным з артыкулаў проф. Піотуховіча, на якія ён указвае ў лісьце, што, быццам, у іх адбіваецца паварот ад нацыянал-дэмократычнай концэпцыі да марксызму («Рэволюцыя і Культура“, 1929 г. № 1). Рэдакцыя констатуе што:

а) проф. Піотуховіч у больш тонкай форме працягвае тыя-ж ідэі, як і ў „Нарысах“. Напр., вядомы нацыянал-дэмократ М. Гарэцкі ставіцца ў выдатныя пісьменьнікі „Маладняка“ і БелАПП'у і тым самым прывязвае пролетарскую культуру к нацыянал-дэмократычнай „калясьніцы“;

б) нацыянал-дэмократа Зарэцкага ставіць на адзін узровень з Александровічам, які вядзе барацьбу за пролетарскую літаратуры з сялянскай стыхіяй;

в) проф. Піотуховіч не дае крытыкі і ня ўскрывае памылак „Узвышша“ і „Полымя“;

г) проф. Піотуховіч мініатурнасьць твораў беларускай літаратуры тлумачыць адсутнасьцю профэсыяналаў поэтаў і рахітычным становішчам Беларускага Выдавецтва. Мы лічым, што з пункту погляду марксызму гэта зьяўляецца няправільным: як жанры, так і іх разьмеры, а роўна-ж і зьяўленьне профэсыяналаў пісьменьнікаў і выдавецтваў абумоўлена гістарычнымі ўмовамі, у якіх адбівалася клясавая барацьба, якая мела ўплыў і на вышэйсказанае.

Па-трэцяе—у артыкуле тав. Вязіна супярэчнасьцяй, на якія указвае проф. Піотуховіч, няма. Гэтыя супярэчнасьці маюцца ў самога профэсара і заключаюцца ў наступным, профэсар; даўшы сваё азначэньне нацыі, якое ў артыкуле правільна расцэнена, як „законсэрвованасьць і нярухомасьць“, пр[...] водзіць азначэньне, дадзенае т[...] Сталіным. Азначэньне т. Ста[...] супярэчыць азначэньням проц. [...]туховіча, але гэта здарылася та[...] што проц. Піотуховіч, як і сам [...] зазначае, карыстаецца эклектычн[...] мэтадам, які складаецца з элем[...]таў розных мэтадаў і, як праві[...] —не пазбаўляе ад супярэчнась[...] а нясе з сабой супярэчнасьці.

Што-ж датычыць Гаруна, [...] аўтар ня мог ня ўскрыць яго [...] праўднага твару на працягу [...] яго поэтычнай творчасьці і [...]тычнай політычнай чыннасьці, [...] проф. Піотуховічам была завуаляв[...]

Па-чацьвертае—калі проф. Піо[...]ховіч жадае (а нам-бы гэтага ха[...]лася) крута павярнуць у бок ма[...]ксызму, ён павінен сам ускрыць [...] свае памылкі, даць ім належ[...] ацэнку і выправіць. Умаўчван[...] аб памылках, альбо змазваньне [...] ня дасьць магчымасьці пераўзбро[...]ца і стаць цьвёрда на глебе ма[...]ксызму з усімі вынікамі, якія ад[...]туль выцякаюць.

А пакуль што мы можам конс[...]таваць, што проф. Піотуховіч [...] хоча глыбока ўскрываць сваіх [...]мылак, а пакідае лазейкі му[...] дзеля таго, каб у адпаведны[...]шы для яго час, адступіць на [...]цыянал-дэмократычныя позыцыі.

Аўтар артыкулу на падставе [...]тага меў рацыю назваць [...] проф. Піотуховіча нацыянал-[...]кратычнай сыстэмай.

Мы чакаем ад профэсара Піо[...]ховіча ня толькі прызнаньня [...] асобных памылак, але разгорну[...] крытыку і яе сутнасьці і шко[...]насьці нацыянал-дэмократызму [...] огул.

Юнкоры пішуць

* Пры саўгасе „Патапенка Харомы“, Глускага р-ну, комсамольская ячэйка на парозе развалу. Сэкратар комсамольскай ячэйкі нічога ня робіць, каб ажывіць працу.

Юнкор.

* Праца Людзяневіцкай комсамольскай ячэйкі, Жыткавіцкага раёну, у апошні час зусім заняпала. Комсамольская ячэйка з-за халатнасьці і нежаданьня сэкратара яе т. Майсеенка не працуе. Ня ўдзельнічаюць у працы па палепшаньню работы колгасаў.

КІМ.

* Комсамольская ячэйка пры колгасе „Маяк Соцыялізму“ не праводзіць аніякай культмасавай працы. Ячэйка ня ўключылась ў барацьбу за ўсеагульнае навучаньне.

Мэбель.

* Большасьць комсамольцаў мобілізаваных на працу ў Донбас з Плешчаніцкага раёну, вярнулася назад.

Ячэйкі і райкомы нічога не прадпрымаюць супроць гэтых комсамольцаў.

Гарбуз.

* У Бялынькавіцкай ШКМ загадчык школы, тав. Габрукевіч П. Г., дае няправільныя даведкі выключаным з школы. Так, пазбаўленцу Папову ён ня даў даведкі аб тым, што той выключан, як пазбаўленец, а абыйшоў у даведцы слова пазбаўленец.

Іскра.

* Даманавіцкая колгасная ячэйка Старобінскага р-ну зараз зусім не працуе. Некаторыя комсамол[...] толькі і ведаюць, што „рэжуць“ карты.

Юнкор Х.

* Дрэнны рост комсамольск[...] ячэйкі Бікласка, Вешанковіцк[...] р-ну, можна тлумачыць тым, [...] комсамольцы гэтай ячэйкі не [...]ляюцца прыкладам і бязьдзейнічаю[...]

Кудравы Патрон.

* У Амсьціслаўскай комсамо[...]скай ячэйцы (Бягомель) замест [...]цы—пустая лухта. Сэкратар яч[...] Майзэль толькі і ведае, што [...]чыць.

Жучык.

* Комсамолец-настаўнік Чуб[...]кай школы (Ветрынскі р-н) т. [...]раўёў адмаўляецца ад грама[...] працы. Комсамольская ячэйка [...]чыла яму правесьці сходы [...] так, але ён гэтага не зрабіў. [...]цікавіцца сваёй працай у школе, [...] ўдзяляе належнай увагі ўсеагул[...]му навучаньню.

П. Вясел[...]

Зусім дрэнна працуе ячэйк[...] вёскі Борхава Уваравіцкага раё[...] Сэкратар дасканала ня ведае кольк[...] ў ячэйцы комсамольцаў.

Х.

Дрэнна стаіць справа з выха[...]ваньнем у 4-ай дзеткомуне (Ма[...]лёў). Гарком комсамолу ніякай ўв[...] не ўдзяляе гэтай комуне.

Хэйфец Арон

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР—
РЭДКОЛЕГІЯ

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599